Следует отметить, что в народном искусстве, важной составляющей которого являлась деревянная объемная пластика, всегда проявлялось коллективное начало как главный стержень его жизнедеятельности и развития. Традиции, которые вырабатывалась коллективным опытом народа, сохранялись из поколения в поколение, превращались не только в устоявшиеся приемы и образы в искусстве, но и становились определенной формой художественного мышления народа, отражая его мировоззрение. Эти традиции сохранились в народном изобразительном искусстве и до нашего времени, актуализируясь уже в ином его мировоззренческом осмыслении современными белорусскими резчиками. В настоящий период многие мастера объемной пластики вернулись к традиционным образцам народного искусства, с особым пристрастием отображают фольклорные, исторические, мифологические темы и сюжеты и, как бы заново переосмысливая традиционные эстетические каноны и, преломляя их через призму современной жизни, создают станковые и монументальные объемно-пластические художественные произведения.

**Список литературы:**

1. Пластыка Беларусі XVII–XVIII стагоддзяў / аўт. і склад. Н. Высоцкая. – Мінск : Беларусь, 1983. – 230 с.
2. Шаура, Р. Развіццё народнага выяўленчага і дэкаратыўнага мастацтва Беларусі другой паловы XX–пачатку XXI ст. / Р. Шаура. – Мінск : БДУКМ, 2006. – С.203–204.

***Юлія Атрошчанка***

**НАРОДНЫЯ ЎЯЎЛЕННІ ПРА СЯМ'Ю**
**(*на матэрыялах беларускіх легенд, былічак і бывальшчын*)**

***Yuliya Atroshchanka***

**FOLKLORE FAMILY IDEALS**
**(*on the material of Belarus folk legends, true stories*)**

*Артыкул асвятляе, як у беларускіх легендах, былічках і бывальшчынах увасоблена мадэль традыцыйнай сям'і, чальцы якой падпарадкоўваюцца патрыярхальнай сістэме адносін і сацыяльнай арганізацыі.*

*The article deals with, how Belarusian legends and true stories embodies the model of the traditional family, whose members are subject to the patriarchal system of relations.*

Легенды беларусаў фіксуюць гарманічную тэорыю ўтварэння сям'і. Маўляў, Бог сам размяркоўвае пары, злучае супрацьлеглых па характары людзей: лянівму хлопцу дастанецца працавітая жонка, а адказнаму – гультайка. Мудрасць такіх шлюбаў у тым, каб сем'і былі паміж сабой сацыяльна роўныя, не вылучаліся багатыя і бедныя: «Так вот і жывуць тады, не прападая. Адзін аднаго ўспамагаець, і прадалжаецца жызнь. А багатыя пра Бога забываюць. Добра жывуць, усяго ім хватае, так што ім. А бедны так усё болей да Бога, просіць, штоб Бог памог» (легенда «Як Бог пары злучае») [2, с. 389–390].

Жанчына ў беларускай народнай прозе, хоць і падпарадкоўваецца патрыярхатным законам грамадства, не мае статусу абмежаванай, бяспраўнай асобы. У традыцыйнай сям'і беларусаў муж паважаў сваю жонку і адводзіў не апошняе месца яе меркаванням: «Пачалі жонкі сварыцца паміж сабой, пачалі калаціцца да падбухторваць сваіх гаспадароў. У адзін голас крычаць: дзяліцца да дзяліцца. Пачалі браты дзяліцца» (легенда «Палешукі і палевікі») [1, с. 79]. Аднак улада жонкі ў кантэксце народнага светабачання ацэньваецца негатыўна, легендарная проза сцвярджае непахіснасць грамадскай сістэмы, дзе дамінуючая роля належыць мужчыне. Гэта добра відаць ў творы «Чаму Бог зрабіў мужыка старшым над жонкаю», дзе паказана, што магло б атрымацца, калі галоўнай у сям'і была б жанчына. Яна выконвае ўсе функцыі мужчыны, капіруе яго паводзіны, ёй надаюцца рысы мужчынскага характару: «Была ў аднаго жонка вельмі ліхая: бала, прыйдзе з карчмы запіўшыся, гракане ў дзверы. Ён, небарака, мусіць уставаць да і бардзей адчыняць. А як часам няхутка прачхнецца, так яна зараз за качаргу і чыста яго заб'е» [1, с. 102]. Здарылася зайсці да іх Богу і Пятру. Пасля таго, як баба пабіла Пятра, той папрасіў Бога, каб ён зрабіў галоўным мужчыну [1, с. 103]. Беларуская народная проза тлумачыць законы існуючай гендарнай сістэмы, калі ўсё адпавядае нормам патрыярхатнага грамадства, што забяспечвае захаванне гармоніі свету.

У народных творах адзначаецца моцная духоўная сувязь паміж мужам і жонкай. Нават пасля смерці нябожчыкі наведваюць сваіх блізкіх. У былічцы «Муж-нябожчык» пакойны прыходзіў да жонкі жыць[4, с. 648], а ў бывальшчыне «Як жонка-нябожчыца хадзіла» памерлая жанчына душыла свайго мужа за тое, што ён ажаніўся з другой [3, с. 476]. Каб пазбавіцца ад наведванняў пакойніка, жанчына выходзіла другі раз замуж. Але ўдава была не самай прывабнай нявестай, тым больш з дзецьмі, таму яна часцей заставалася без мужа. Што нельга сказаць пра мужчыну, які рэдка быў самотны. Пра ўдаўца ў народнай прозе амаль не згадваецца, без жонкі заставаўся толькі стары чалавек, і то бывала, што ён браў сабе маладую нявесту, як, напрыклад, у бывальшчыне «Баннік» [1, с. 165]. Не акцэнтуецца матэрыяльнае або сацыяльнае становішча адзінокага мужчыны. Ён не мог выконваць жаночыя справы, таму месца гаспадыні хутка займала іншая жанчына.

Вобраз удавы ў народнай прозе пададзены неадназначна. У беларускіх легендах апісваецца добрая, спагадлівая жанчына, якая засталася пасля мужа галоўнай у сям'і і ўзяла на сябе адказнасць за забеспячэнне і ахову сваіх родных. Матэрыяльнае становішча такой жанчыны вельмі беднае: дзяцей у яе шмат, есці няма чаго, жыве ў куране на ўскрайку вёскі. На долю ўдавы Бог пасылае шмат выпрабаванняў: то яе карову воўк задушыць (легенда «Пра апошнюю карову ўдавы») [2, с. 396], то апошні хлеб украдуць (легенда «Бог і ўдава») [1, с. 130–131].Іншы вобраз прадстаўлены ў былічках і бывальшчынах: тут удава нярэдка атаясамліваецца з ведзьмай (бывальшчына «Маці-ведзьма») [3, с. 498].

Беларускія народныя творы сцвярджаюць, што асноўнай функцыяй жанчыны з'яўляецца рэпрадуктыўная: «Ведама, якая жанчыне жытка, калі ў яе няма дзяцей» (бывальшчына «Доля добрая, та й жытка добрая») [1, с. 202]. Важным фактам з'яўляецца нараджэнне дзіця ў шлюбе. У былічцы «Баль нячыстых» дзяўчына сустракалася з хлопцам і зацяжарыла. Блізкія асуджалі, а суседзі параілі ёй павесіцца. У выніку яна скончыла жыццё самагубствам [2, с. 446]. У беларускіх легендах і былічках мужчына выконвае ролю ахоўніка сям'і, адказвае за бяспеку дзяцей. Часта гаспадар адстойвае свае правы на нашчадкаў перад нячыстай сілай. Так, у былічцы «Гуменнік» дзядок у чорнай вопратцы прасіў у бацькі аддаць тое, што той у сваім доме не ведае. Гаспадар адмовіўся. Падняўся віхор, і амаль усю ноч мужчына змагаўся з гуменнікам. А раніцай даведаўся, што ледзь не аддаў нячыстай сіле дачку, якая нарадзілася ў гэтую ж ноч [1, с. 163–164].

Народныя творы ўвасабляюць уяўленне пра залежнасць дабрабыту сям'і і здароўя дзяцей ад сумленнасці выканання сваіх функцый мужчыны як гаспадара. У былічцы «Прысыпуш» гаворыцца наступнае: «Як хто рубіць дровы, ды нарубіўшы, кінець калодку там. Січас сдзелаюць [чарты] рукі, ногі – дзяцёнка, звестна, нежывога і падложуць матцы, а яе жывенькага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сабе возьмуць» [1, с. 168]. За працу ў святы караецца не бацька ці матка, а іх нашчадкі. Калі мужчына ў такі дзень гне палазы, то ў яго народзіцца дзіця з пагнутымі ножкамі (былічка «Работа на Каляды») [4, с. 640]; калі жанчына вышывае, то на целе нованароджанага будуць плямы ў выглядзе крыжыкаў (былічка «Пакаранне за работу») [2, с. 428]; маці рубала буракі карове – у сына пальчыкі адпалі (былічка «Работа на Пасху») [4, с. 641]. Грахоўныя дзеянні такім чынам адбіваюцца на родзе гэтых людзей, тым самым падмацоўваючы думку, што за нядобрыя ўчынкі бацькоў павінны расплачвацца дзеці.

Вобраз нявесткі ў беларускай легендарнай і міфалагічнай прозе суадносіцца з традыцыйным паказам маладой у патрыярхатнай сям'і. Яна займае ніжэйшую ступень у сістэме ўнутрысямейных стасункаў, падпарадкоўваецца волі свекрыві, выконвае яе загады, стараецца не гнявіць: «Я баялася свякроўкі як агню. Вельмі цяжка было зімою, бо заўсёды на аччу. Здаецца, робіш, як найлепш, а тут работа з рук падае. А тут баішся й без дзела сядзець, каб свякроўка не ўпікнула, што нявехна гультайка, дарам хлеб есць» (былічка «Ведзьма ў постаці жабы») [1, с. 216]. Існаваў падзел працы паміж свекрывёю і нявесткай: «Свякроў дома завіхаецца кала печы да даглядае гаспадарку», а нявестка «рабіла на двары, або ў вагародзе, ці на полі» (былічка «Ведзьма ў постаці жабы») [1, с. 216]. Часам у творах адзначаецца нядобрае стаўленне свекрыві да нявесткі. Так, у легендзе «Як Ангел спас ад самагубства» бацькі мужа ледзь не давялі маладую да граха [4, с. 619–620], а ў былічцы «Як нячыстага духа ў выглядзе свекрыві ад хаты адвадзілі» свякроў і пасля смерці не давала нявестцы спакою [4, с. 645]. Увогуле, вобраз свекрыві ў былічках і бывальшчынах нярэдка суадносіцца з чараўніцай. Толькі яна можа пазбавіць немаўля ад радзімых плям у выглядзе крыжыкаў, што з'явіліся на целе дзіця ў выніку грахоўных дзеянняў яго маці, якая вышывала ў Святыя вечары (былічка «Пакаранне за работу») [2, с. 428]. Ёсць прамыя згадкі пра вядзьмарства родзічкі, якая хацела аддаць нячыстай сіле сваіх унукаў: «Была свякроўка ведзьма» (бывальшчына «Пра свякроўку-вядзьмарку») [3, с. 499].

Зяць займае больш моцную пазіцыю ў сям'і, чым нявестка. У адносінах цешчы да зяця асноўным крытэрыем з'яўляюцца яго стаўленне да сваёй жонкі – яе дачкі: калі маладыя жывуць добра, то зяцю давяраюцца нават веды чорнай магіі (бывальшчына «Як чараўнік паміраў») [2, с. 473], а калі мужчына не паважае сваю нарачоную, то ён будзе пакараны, магчыма, ператвораны ў іншую істоту (бывальшчына «Як цешча зяця ваўком зрабіла») [2, с. 471].

Такім чынам, у беларускіх легендах, былічках і бывальшчынах усё гаворыць пра асаблівае стаўленне беларусаў да сямейных сувязей і іх веру ў святасць такога саюзу, які злучыў сам Бог. Зберагаецца субардынацыя паміж старэйшымі і малодшымі членамі сям'і: жонка паважае мужа, дзеці слухаюцца сваіх бацькоў, нявестка падуладная свекрыві. Парушэнне дадзенай сацыяльнай мадэлі выклікае негатыўныя наступствы. У беларускай легендарнай і міфалагічнай прозе адзначаецца важная функцыя сям'і – прадаўжэнне роду, забеспячэнне дабрабыту і аховы дзяцей. Каб дзеці былі здаровыя і шчаслівыя, бацькі павінны сумленна адносіцца да сваіх гаспадарчых абавязкаў, прытрымлівацца хрысціянскіх канонаў і запаведзяў.

**Спіс літаратуры:**


1. Легенды і паданні / склад. М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 544 с.
2. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / рэдкал.: Т. Б. Варфаламеева [і інш.]. – Мінск : Выш. шк., 2001 – 2013. – Т. 3 : Гродзенскае Панямонне : у 2 кн. / А. М. Боганева [і інш.]. – Кн. 2. – 2006. – 736 с.
3. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / рэдкал.: Т. Б. Варфаламеева [і інш.]. – Мінск : Выш. шк., 2001 – 2013. – Т. 4 : Брэсцкае Палессе : у 2 кн. / А. М. Боганева [і інш.]. – Кн. 2. – 2009. – 863 с.
4. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / рэдкал.: Т. Б. Варфаламеева [і інш.]. – Мінск : Выш. шк., 2001 – 2013. – Т. 6 : Гомельскае Палессе і Падняпроўе : у 2 кн. / А. М. Боганева [і інш.]. – Кн. 2. – 2013. – 1231 с.



***Наталья Шелупенко***


## ФЕСТИВАЛЬ КАК ЭФФЕКТИВНАЯ ФОРМА ПОПУЛЯРИЗАЦИИ ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНОГО НАСЛЕДИЯ МАЛЫХ ГОРОДОВ БЕЛАРУСИ


***Natalya Shelupenko***


## FESTIVAL AS AN EFFECTIVE FORM OF POPULARIZING HISTORICAL AND CULTURAL HERITAGE OF SMALL CITIES OF BELARUS


*В статье рассматривается значение историко-культурного наследия в развитии малых городов Беларуси, анализируются фестивали и их роль в популяризации историко-культурного наследия малых городов.*

*The article observes the importance of historical and cultural heritage in the development of small towns of Belarus, analyzes festivals and their role in promoting the historical and cultural heritage of small towns.*


Историко-культурное наследие является важным ресурсом социально-экономического и культурного развития современного белорусского общества, а его сохранение и популяризация – приоритетное направление государственной политики в сфере культуры. Значительную часть историко-культурного наследия Беларуси составляет материальная и нематериальная культура малых городов. Понятие малый город в научной литературе не имеет однозначного толкования и рассматривается с различных точек зрения. С позиции исторического подхода понятие малый город связано с такими категориями как местечко, уезд, волость. Так А.И. Локотко определяет малый город как «местечко – исторически уникальный тип поселения в Беларуси – занимает промежуточное положение между городом и деревней», и отмечает, что «бывшие местечки – это поселения с числом жителей от 3 до 15 тыс. человек»[1, с.28]. В контексте системного подхода малый город рассматривается как элемент региона, то есть системы более высокого уровня и определяется как «автономный хозяйствующий территориальный субъект со сформированной инфраструктурой и специфическим социально-психологическим климатом, с численностью населения до 50 тыс. человек, разделенной на социальные слои и группы согласно сформированной структуре производства» [2, с.252].

Исследователи также рассматривают малый город как место разнообразных контактов: профессиональных, конфессиональных, этнических, национальных и др. В современной инфраструктуре Беларуси малые города представляют наиболее многочисленную группу поселений. Большинство из них (Пружаны, Дятлово, Коссово, Туров, Заславль, Быхов, Несвиж, Новогрудок и др.) имеют многовековую историю, неповторимый облик, особую атмосферу, отражающую самобытность национальной культуры и традиций. Малые города Беларуси располагают значительным историко-культурным наследием, представленным объектами архитектуры, градостроительства, искусства, музейными коллекциями, народными



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ